**В.І.Саітава**, *дацэнт*

# НАЦЫЯНАЛЬНА-ПАТРЫЯТЫЧНАЕ ВЫХАВАННЕ БІБЛІЯТЭКАРАЎ-КРАЯЗНАЎЦАЎ У ПРАЦЭСЕ ПРАФЕСІЙНАЙ ПАДРЫХТОЎКІ (на прыкладзе курса "Краязнаўчае крыніцазнаўства" на факультэце завочнага навучання)

Для сучаснага беларускага грамадства актуальнымі з'яўляюцца захаванне гісторыка-культурнай спадчыны, выхаванне патрыятычна свядомай і адказнай за лёс краіны моладзі. У падрыхтоўцы кадраў па спецыялізацыі "бібліятэказнаўства і бібліяграфія, краязнаўства" вельмі важна выхаваць студэнтаў як прадстаўнікоў беларускай нацыі і свядомых патрыётаў. Патрыятызм моладзі фарміруецца на аснове культурна-генетычнага фонду народа і палітыка-ідэалагічнага ўздзеяння. Глыбіннай асновай яго з'яўляецца культурна-генетычны фонд народа [1]. Архетып народа і нацыі складваецца многія стагоддзі і перадаецца з пакалення ў пакаленне. Сучасныя даследчыкі адзначаюць, што выхоўваць патрыятызм на аснове культурна-генетычнага фонду народа і іншых яго культурна-гістарычных каштоўнасцей складана, але гэта шлях глыбокага і асэнсаванага засваення індывідуумам патрыятычнага светапогляду [1, с.18–19].

Больш даступнай для мэтанакіраванага ўздзеяння з'яўляецца палітыка-ідэалагічная аснова патрыятызму, якая фарміруецца дзяржаўна-палітычнымі структурамі грамадства і непарыўна звязана з іх палітычнымі і сацыяльна-эканамічнымі інтарэсамі. Палітыка-ідэалагічная аснова патрыятызму разглядаецца як другаснае каштоўнаснае ўтварэнне, як надбудова над фундаментальнымі светапогляднымі і каштоўнаснымі яго асновамі [1]. У Канцэпцыі патрыятычнага выхавання моладзі ў Рэспубліцы Беларусь адзначана, што "канкрэтна накіраванасць патрыятызму вызначаецца яго ідэалагічнай асновай" [2]. На наш



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

погляд, неабходна звярнуць увагу на сувязі паміж дзвюма базавымі асновамі патрыятызму: культурна-генетычнай і палітыка-ідэалагічнай. Напрыклад, тэматыка выступленняў і іншых формаў работы, відавочна звязаная з палітычнымі задачамі, якія ставяцца ў канкрэтны час, можа закранаць каштоўнасці архетыпнага плана, немалыя вынікі прыносіць іх інтэрпрэтацыя. Прыкладам таму можа быць такая знакавая падзея, як Вялікая Айчынная вайна, што захавалася ў генетычнай памяці народа Беларусі, памяць аб ёй дзесяткі гадоў жывіць патрыятычнае выхаванне.

Вядома, што сапраўдны бібліятэкар-краязнавец – гэта унікальны спецыяліст сферы інфармацыі, веды, уменні навыкі якога набываюцца і фарміруюцца ўсё працоўнае жыццё. На завочным факультэце універсітэта ў бягучым навучальным годзе пачалася падрыхтоўка студэнтаў па спецыялізацыі “краязнаўчае крыніцазнаўства”. Першыя сустрэчы са студэнтамі паказалі, што многія з іх займаюцца краязнаўчай работай у бібліятэках, ведаюць значныя і цікавыя гістарычныя факты і падзеі, літаратуру, мясцовых краязнаўцаў. Але студэнты жадалі б лепш ведаць свой край, населены пункт, зацікаўлены ў набыцці ўменняў здабываць краязнаўчыя веды.

Улічваючы значэнне краязнаўства для выхавання патрыятызму, неабходна вызначыцца ў прыярытэтах адукацыйнай і выхаваўчай дзейнасці ў працэсе падрыхтоўкі студэнтаў-завочнікаў па курсе “Краязнаўчае крыніцазнаўства”. Як будучым інфармацыйным спецыялістам па краязнаўстве ў межах дадзенай дысцыпліны ім неабходна набыць сістэматызаваныя і паглыбленыя веды аб дакументаваных крыніцах, з дапамогай якіх можна вывучаць культурна-гістарычную спадчыну той ці іншай мясцовасці з мэтай захавання яе адметнасці і паспяховага комплекснага развіцця ў якасці суб’екта дзяржавы. Адной з функцый курса з'яўляецца светапоглядная. Сутнасць яе заключаецца ў тым, што інфармацыйнае забеспячэнне ў спалучэнні з любым відам краязнаўчых даследаванняў і папуляры-

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

зацыі краязнаўчых ведаў, дзейнасці па сацыяльна-эканамічным і любым іншым кірунку рэгіянальнага развіцця спрыяе фарміраванню спецыфічнага інфармацыйнага-рэгіянальнага стылю і логікі мыслення. Задача выхавання патрыятызму закладзена ва ўсім змесце дадзенай дысцыпліны, у тых высновах і ацэнках, якія даюцца на занятках, у абмене думкамі са студэнтамі, у абмеркаванні выкананых імі заданняў, у гутарках са студэнтамі. Менавіта веды ў працэсе адукацыі з'яўляюцца прыярытэтнай асновай развіцця патрыятызму, і на аснове ведаў могуць фарміравацца светапоглядныя, у тым ліку патрыятычныя, пачуцці і прадстаўленні.

У патоку дакументаваных крыніц краязнаўства зроблена спроба вылучыць тыя кампаненты, якія найбольш поўна і даставерна адлюстроўваюць факты і здабыткі рэгіянальнага развіцця. Змест курса склалі тэмы аб асобных мясцовасцях у мінулым, рэгіянальнай геральдыцы, генеалогіі, дыялекталогіі, разнастайныя звесткі аб насельніцтве і інш.

Формы вучэбнай дзейнасці таксама накіраваны на развіццё светапогляду бібліятэкара-краязнаўцы і патрыятызму. Асаблівае значэнне ў завочным навучанні адводзіцца кантрольнай рабоце. Па дадзеным курсе змест кантрольнай работы складаецца з чатырох заданняў, выкананне якіх патрабуе ведання крыніц, прысвечаных мясцовасці. Асобнае заданне прысвечана вывучэнню гербаў роднага горада ці рэгіёну, якія існавалі ў мінулым і зацверджаны сёння. Для яго выканання студэнты звяртаюцца да новых беларускіх энцыклапедый, пастаноў мясцовых органаў улады, гербоўнікаў, навуковай і навукова-папулярнай літаратуры. Апісанні гербаў суправаджаюцца тлумачэннямі змены гербавых выяў. У гэтым заданні можна прасачыць узаемадзеянне глыбінных гістарычных і палітыка-ідэалагічных уплываў, асэнсаваць іх вынікі. Спецыяльнае заданне прысвечана вывучэнню гісторыі сваёй сям'і. Студэнты з цікавасцю працуюць над сваімі радаводамі: звяртаюцца да сямейных

дакументаў, наведваюць сваіх родзічаў ці звязваюцца з імі з дапамогай паштовай сувязі.

У выніку выканання заданняў большасць прадставілі інфармацыю аб продках да чатырох–пяці кален, з прозвішчамі, датамі жыцця, месцамі нараджэння, веравызнаннем, прафесіяй ці родам заняткаў, сацыяльным становішчам і іншымі данымі. Пры абмеркаванні заданняў студэнты расказвалі цікавыя гісторыі з жыцця сваіх родных. Карысна было б паглыбіць гэты пошук, звярнуўшыся да спецыяльных друкаваных крыніц, але іх недахоп у рэгіёнах і адсутнасць адпаведнага часу падчас вывучэння курса на сесіі пакуль што не дазваляюць зрабіць гэта.

Асобнае заданне кантрольнай работы прысвечана збору рэгіянальнага моўнага матэрыялу. Зборам моўнага матэрыялу займаюцца некаторыя беларускія публічныя бібліятэкі, разглядаючы гэту дзейнасць як уклад у даследаванне родных мясцін. Студэнты запісалі цікавыя словы і выразы, патлумачылі сэнс, прывялі прыклады ўжывання. Параўнанне слоў з існуючымі рэгіянальнамі моўнымі слоўнікамі дазволіла зрабіць высновы аб наяўнасці/адсутнасці слоў, змене іх сэнсу.

Практычныя работы былі прысвечаны азнаямленню з тэкставымі і рэчавымі крыніцамі. Рэчавыя крыніцы, як вядома, нярэдка выкарыстоўваюцца бібліятэкамі для стварэння арыгінальнага інтэр'ера. Студэнты 437 групы наведалі музей-сядзібу знакамітага мастака В.Ваньковіча, дзе пазнаёміліся з бытам радавітай мінскай шляхты, затым агледзелі ратушу і пабывалі на экскурсіі на кафедрах дзвюх вядучых хрысціянскіх канфесій: у Свята-Духавым саборы і касцёле Дзевы Марыі, а таксама ў касцёле святых Алены і Сымона. На практычных занятках студэнты выканалі індывідуальныя пошукавыя заданні па зборніках афіцыйных дакументаў, актавых і справодных дакументаў (дарэвалюцыйных і даваенных).

Семінарскія заняткі прысвечаны краязнаўчай мемуарыстыцы. Акрамя пытанняў, звязаных з характарыстыкай гэтых кры-

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

ніц, кожны студэнт выявіў і прачытаў два мемуарныя творы розных гістарычных перыядаў, прысвечаныя родным мясцінам. Студэнты самастойна выявілі гэтыя творы, у тым ліку рукапісныя, што захаваліся ў бібліятэках, сабралі звесткі аб асобах мемуарыстаў.

Падчас лекцый раскрываецца значэнне пэўнай групы крыніц для краязнаўчай дзейнасці бібліятэкі, для задавальнення тых ці іншых патрэбнасцей спажыўцоў краязнаўчых ведаў з улікам сферы выкарыстання. Звяртаецца ўвага студэнтаў на бібліяграфічнае аснашчэнне дакументных крыніц, каб навучыць іх умела выкарыстоўваць бібліяграфічныя матэрыялы ў выданнях, рабіць высновы аб адпаведнасці бібліяграфічных матэрыялаў патэнцыяльным спажыўцам і мэтам выкарыстання інфармацыі, сінтэзаваць кола бібліяграфічных матэрыялаў, якія ў сукупнасці могуць забяспечыць пэўныя патрэбнасці.

Пры выкладанні курса прынцыповым з'яўляецца палажэнне аб непарыўнай сувязі паміж рэгіянальным і дзяржаўным, імкненне пераканаць студэнтаў у тым, што вывучэнне мясцовых гістарычных і сучасных каштоўнасцей у канчатковым выніку служыць раскрыццю здабыткаў і дасягненняў Айчыны. Любоў да родных мясцін павінна быць асэнсаваным грамадзянскім пачуццём, як і да краіны.

Такім чынам, матэрыял курса "Краязнаўчае крыніцазнаўства" дазваляе выхоўваць і паглыбляць патрыятычныя пачуцці студэнтаў, выкарыстоўваючы для гэтага культурна-гістарычныя здабыткі і сучасныя палітыка-ідэалагічныя падыходы.

---

1. *Осипов А.* Наша сила – в подлинном патриотизме // Беларуская думка. – 2005. – №1. – С.16-22.

2. *Концепция* патриотического воспитания молодежи в Республике Беларусь // Праблемы адукацыі і выхавання. – 2004. – № 6. – С.113-119.



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ